***В. І. Еўмянькоў***
*Магілёў*

# САРМАТЫ Ў ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ І ПОЛЬШЧЫ ПЕРЫЯДУ АСВЕТНІЦТВА

*This article discusses the problem of sormatyzm in the literature of Belarus in the XIX century. It analyses the works by Latinspeaking (M. Karytsky) and Polishspeaking (Y. Nyamtsevitch, Y .Khodzka) authors.*

У перыяд з 1730 па 1800-я гг. сарматызм як дамінуючая ідэалогія Рэчы Паспалітай эпохі панавання ў ёй Саксонскай дынастыі быў нібыта «канчаткова» зруйнаваны асветнікамі (Ф. Багамолец, Ю. Нямцэвіч,

ив библиотеки МГУ име

Г. Калантай, Ст. Сташыц). «Віленскія і варшаўскія мудрацы», якія вялі ідэалагічную барацьбу з прадстаўнікамі буйных магнацкіх кланаў, спачатку вельмі асцярожна, але надзвычай паслядоўна і настойліва прывучалі чытача бачыць у «старасвецкіх панах» не герояў («Хацімская вайна» В. Патоцкага), а злачынцаў і «кантушовых д'яблаў» (У. Сіцінскі, М. Патоцкі, Ю. Несялоўскі і інш.); без асаблівага шкадавання выводзілі на сонечнае святло дзівакоў і прайдзісветаў (Старушкевічаў і Гадульскіх, Таргавіцкіх і В. Сяцехаў).

Аднак у першай палове XVIII ст. вайна асветнікаў з «паголенымі патыліцамі» толькі пачыналася. Прагрэсіўныя пісьменнікі хоць і ўзбройваліся сатырай, але мусілі быць асцярожнымі, выяўлялі сарматаў у алегарычных вобразах – напрыклад, як драпежных птушак або звяроў (Д. Рудніцкі, М. Карыцкі). Аўтары пакідалі чытачу магчымасць самастойна вырашаць, хто з вялікіх або малых паноў схаваны пад той ці іншай маскай.

Так, у гратэску Д. Рудніцкага «Нязгода птаства...» паўстае вобраз «чорнага кручышча», які «пабіў, паеў, палупіў» дзяцей лясных птушак. Тыя звярнуліся «на сонд» да арла, які «казаў крука біць у слупа». Крук – «простэ мужычышча» («просты хлопе»). І ў гэтым выпадку алегорыя, здавалася б, зразумелая: шляхта (птушкі) звярнуліся па дапамогу да цара / караля (арол), каб пакараць мужыка (чорнага крука), які «парваў» іх дзетак.

Аднак з «расшыфроўкай» дадзенай алегорыі не ўсё так проста. Справа ў тым, што буйныя сялянскія паўстанні на тэрыторыі Беларусі (Крычаўскае (1743 – 1744), Камянецкае (1754 – 1756) і Шаўлінскае (1769)) адбыліся ўжо пасля смерці Д. Рудніцкага. Магчыма, гутарка пра правадыра гайдамакаў? Войскі ўкраінскай галоты сапраўды даходзілі да Беларусі, спусташалі шляхецкія засценкі. Гэту думку нібыта пацвярджае тое, што чайка азначае свайго крыўдзіцеля словам «галота» («Ты чапліска, галота, што ты ўчыніла?»). На гэтай версіі спыняецца А. Мальдзіс. Крук, лічыць даследчык, – гэта «народны заступнік, казацкі атаман, які не дае спакою шляхце» [1, 119]. Аднак гайдамацкія хвалі дасягнулі Беларусі толькі на пачатку 1740-х гг., таксама пасля смерці аўтара. Атрымліваецца, што і першы, і другі варыянт для Д. Рудніцкага не быў актуальным. Што ж тады?

Жыццё паэта супала з барацьбой паміж Аўгустам II Моцным і Ст. Ляшчынскім (алегарычная «нязгода птушак»). Першы карыстаўся падтрымкаю рускага цара, а другі – шведскага караля. Вайна паміж Расіяй і Швецыяй адбывалася на тэрыторыі Літвы-Беларусі, а шляхта і магнатэрыя біліся па абодва бакі барыкад (грамадзянская вайна). Яшчэ ў 1700 г. пад Алькенікамі шляхта, якую падтрымаў Аўгуст II, разбіла войска Сапегаў, а ў 1706 г. ужо К. Сапега разам са шведамі адпомсціў шляхце – спаліў засценкі па ўсёй цэнтральнай Беларусі.

У сувязі з гэтым працытуем чайку: «Ты чапліска, галота, што ты ўчыніла, // За что ж ты маіх Пузынаў дзеці пагубіла?» [цыт. па: 1, 117]. Пузыны, як вядома, ваявалі на баку Аўгуста II. «Парваць» Пузынаў маглі толькі прыхільнікі Ляшчынскага, у прыватнасці Сапегі. Скардзіцца на «чапліску» чайка таксама магла толькі рускаму цару (Пятру I).

Звяртае ўвагу і тое, што з чайкай салідарызуюцца іншыя птушкі (шляхцічы): «І мы многа вельмі злога ад лотра цярпелі // І пакою, над вадою жывучы, не мелі. // Раннай зоры прыляцеўшы, часта галасует, // А сарокам і варонам усёгды фальгует» [цыт. па: 1, 118]. Цяжка ўявіць мужыка, які б галасаваў на соймах, а вось уявіць К. Сапегу пад маскай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

магутнага птаха, які не дае спакою шляхце, магчыма. Але чаму такі зняважлівы зварот да К. Сапегі («галота»)? Д. Рудніцкі быў рэктарам езуіцкага калегіума, г. зн. каталіком, таму не мог падтрымліваць пратэстантаў-шведаў і іх саюзнікаў (у тым ліку Сапегаў). Прыгадаем словы езута з «Люцынкі» В. Дуніна-Марцінкевіча: «Да канца за Аўгуста належыць змагацца! // Сам я за караля пастаяць майго рады» [2, 319]. Відавочна, што такая пазіцыя была ва ўсіх «нашчадкаў Лаёлы», у тым ліку і ў Д. Рудніцкага. Адсюль і пагарда пісьменніка да нібыта здрадніка Сапегі.

Блізкая да зместу «Нязгоды...» і паэма М. Карыцкага «Птушыны сейм». Рэч Паспалітая адлюстравана ў ёй як метафарычны лес, жыхары якога (птушкі) церпяць бедства: «Спусташэнне жахлівае: з намаганнямі звітыя гнёзды // Бурацца, а на вачах у бацькоў дзетак хапаюць» [цыт. па: 3, 74]. Птушкі ў адчаі бароняць гнёзды, клічуць на дапамогу суседзяў. Аднак іх спробы марныя, бо ўжо чуецца паўсюль «журботны голас», які ў лістоце тоне, у глухіх бездарожжах» [цыт. па: 3, 74].

У гэтым малюнку татальнага спусташэння заўважаюцца падзеі апошняга бескаралеўя (1763 – 1764), калі партыі Радзівілаў, Чартарыйскіх, Масальскіх, Браніцкіх і інш. ваявалі за каралеўскі трон, спусташалі краіну, наводзілі жах на грамадзян. Лес – вялікая пастка, як пастка і сама Рэч Паспалітая, бо з усіх бакоў акружаюць птушак-грамадзян «злачынныя рукі», нават паветра, «быццам чыстае, свабоднае», але спавітае «расцягнутымі цянётамі», з якіх «камяні стрымгалоў вылятаюць і раняць смяротна птушак» [цыт. па: 3, 74]. Паветра – метафарычнае ўвасабленне сармацкай свабоды, якая справакавала шляхецкую анархію (пастка), а камяні, якія «раняць птушак», – магнацкія гвалты.

Алегарычны вобраз шляхціца-сармата з'яўляецца і ў камедыі М. Цяцерскага «Доктар па прымусу». Адзін з яе герояў, Савалон, цэлы дзень падарожнічае ад карчмы да карчмы, п'е і махлярнічае. У яго доме – спусташэнне, бо нават ложак брата ён прапіў. Няма справы гаспадару дома і да «чэлядзі». Не «вязальшчык мётлаў», а шляхціц-сармат праяўляўся ў гэтым вобразе. Не трэба было доўга шукаць «савалонаў» па засценках. Шляхта перыяду заняпаду Рэчы Паспалітай давала шмат такіх і яшчэ горшых прыкладаў злачыннага п'янства, марнатраўства. Не вельмі адрозніваецца і адукацыя Савалона ад адукацыі тагачаснага шляхціца. Будучы парабкам пры аптэцы, нахапаўся Савалон лацінскіх выразаў, але сэнсу іх не разумеў, ужываў дзеля вучонай фанабэрыі.

Савалон – плебей. М. Цяцерскі (які, вядома ж, быў скаваны сюжэтнымі рамкамі арыгінальнага твора), хоць і пазначаў хваробы шляхты, але не рызыкаваў (саромеўся?) выставіць у адмоўным святле саму шляхту. Тое ж і ў «Агатцы» М. Радзівіла, у чацвёртай сцэне якой з'яўляецца падстараста Піяшка. Прозвішча гаваркое, бо падстараста – выпівоха, у якога штодня «жніва на піва», ён злы тыран, невук і прайдзісвет. Аднак перадусім ён плебей, чалавек «лядачы», «без роду без племені», які ў двор узяты за заслугі бацькі. М. Радзівіл, які заўважае праблему злачыннага самавольства шляхты, тым не менш старанна абыходзіць яе самы востры вугал (не крытыкуе шляхецкае саслоўе). Падобны падыход і ў камедыі Ф. Карпінскага «Чынш», а пазней і ў «Ідыліі» В. Дуніна-Марцінкевіча.

Бадай, упершыню вобраз сармата быў выяўлены ў варшаўскім «Monitorze», і асабліва ў камедыях Ф. Багамольца. Так, у камедыі «Maiiecstwo z kalendarza» (1766) паўстае пан Старушкевіч, пра якога

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

аўтар у прадмове да другога выдання камедыі напіша: «JP. Staruszkiewicz ma tu na sobie osobę człowieka wychowania grubego, który przez lat kilkadziesiąt rolą i gospodarstwem bawiąc się, nie widział innego miasteczka prócz tego, w którym jego sejmiki bywają. Radzi się on kalendarza XVIII w., wierzy snom, cudzoziemców ma za nic, i mniema, że Niemiec nie jest katolikiem, że wszyscy protestanci są niemieckiej albo saskiej wiary» [6, 3].

Калі ў камедыі Ф. Багамольца сармат выконвае ролю камічнага трыкстара (дзівака), то ў камедыі Ю. Нямцэвіча «Powrót Posła» сармат – небяспечны вораг (дэманічны трыкстар), які супрацьстаіць культурнаму герою (Валерыю), разбурае дзяржаву. Заўважым, што гэты твор – «камедыя палітычная», напісаная пад уражаннем ад падзей на Чатырохгадовым сойме (1788 – 1792).

Палеміка адносна будучыні Рэчы Паспалітай паміж рэфарматарамі і кансерватарамі – адна з галоўных тэм п'есы. Яркі тып кансерватара – стараста Гадульскі. Ён адпрэчвае нават ідэю рэформаў, захапляецца «часамі Саскімі», калі «чалавек еў, піў, нічога не рабіў і грошы меў у кішэні» [5, 47]. Палохае старасту і адмена liberum veto, якое ён лічыць «вольнасці падмуркам», бо «без інтрыг, без якой-кольвек здрады, // Адзін спыніць мог соймы і нарады, // Адзін лёс Айчыны трымаў у руках, // Сказаў: «Не дазволю!» і счэз у дзвярах!»[1] [5, 52]. А зараз «навамодныя галовы, // Прыдумваюць стражы, сойм чыняць гатовы», адкрываюць нібыта шлях дэспатызму. Стараста ўвасабляе бяздумнасць і амаральнасць шляхты перыяду заняпаду Рэчы Паспалітай.

Прыватныя інтарэсы яны, «кантушовыя д'яблы», ставілі вышэй за інтарэсы грамадскія, а соймы разглядалі як арэну для высвятлення адносінаў. Якраз на гэта і звяртае ўвагу Падкаморы, прыхільнік «новай Рэчы Паспалітай» – дзяржавы, у якой пануе не анархія, а «мудрая законнасць»: «Адсутнасць улады і соймаў зрыванне, // Край згубілі, чужынцаў увялі паванне, // Яны і падзелаў, і страт нашых – злая прычына!» Падкаморы згадвае шалёных сарматаў сярэдзіны XVIII ст., якія думалі «пра сябе і ніколі аб народзе» [5, 41].

Такі пан Вацлаў Сяцеха, герой яшчэ аднаго твора Ю. Нямцэвіча «Dwaj panowie Sieciechowie» (1815). Сын засцянковага шляхціца атрымаў адукацыю ў езуітаў, навучыўся ад іх пры ўсялякай нагодзе казаць па-лацінску, але ні сэнсу, ні зместу таго, пра што казаў, не разумеў. Працягнуў адукацыю ўжо пры двары Вялікага гетмана, выканаў тым запавет бацькі, які сцвердзіў, што «шляхціцу, хоць за клямку панскіх дзвярэй, але трымацца трэба». Атмасфера магнацкага двара эпохі войнаў за спадчыну Рэчы Паспалітай сведчыла пра дэградацыю вышэйшага саслоўя: п'янства, сваркі, звады. Магнаты распачынаюць грамадзянскія войны, шляхціцы, падуладныя іх волі, не шкадуюць братняй крыві, зневажаюць законы.

Пан Вацлаў не саромеўся паведаміць, колькі выпіў за сталом або колькі вёсак атрымаў за выкананне злачынных загадаў свайго пана. Чалавек эпохі Барока, ён празмерны ва ўсім: у рэлігійнай экзальтацыі і ў пошуках задавальненняў. Не думаў пан Вацлаў пра лёс Айчыны, калі па загаду Я-вяльможнага Гетмана, зрываў вальны сойм: «Excellentissimus убачыў, што няма іншага выйсця, iussit mibi, як спыніць сойм. Паўстаўшы, крыкнуў я, што было сіл: «Sisto activitatem» і ўцёк за Нёман» [4, 18].

[1] *Тут і далей пераклад з польскай мовы аўтара.* – В. Е.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Праўдзівы тып кантушовага д'ябла і шалёнага, бязглуздага выпівохі, пан Вацлаў увасабляе ў сабе ўсе тыя заганы грамадства (крызіс сарматызму), якія спрычыніліся да заняпаду Рэчы Паспалітай.

Шалёны сармат, дэманічны трыкстар паўстае і ў аднаактавай камедыі Яна са Свіслачы (Ян Ходзька) «Вызваленая Літва, або Пераход Нёмана». Пачатак твора нагадвае змест першых сцэн з камедыі Ю. Нямцэвіча. Спрачаюцца прадстаўнікі дзвюх варожых ідэалогій: кансерватар пан Таргавіцкі і патрыёт, прыхільнік Канстытуцыі 3 мая пан Пачціўскі. Кансерватар папракае рэфарматара ў тым, што той сілкуецца байкамі пра свабоду і роўнасць. Прычынаю ўсіх бед, якія абрынуліся на Рэч Паспалітую, Таргавіцкі называе рэформы, якія адмянілі шляхецкія вольнасці і падрыхтавалі «няволі мулкі ложак». Нагадаем, што Таргавіцкая канфедэрацыя (1792) – гэта саюз рэакцыйнай шляхты, які супрацьдзейнічаў палітычным рэформам і быў падтрыманы расійскімі войскамі.

Сімвалам гэтай канфедэрацыі якраз і з'яўляецца Таргавіцкі. Як мог, ён супрацьдзейнічаў рэформам, «абураўся на падаткі, лаяў іх упарта. / / А сам грошы рассыпаў на карты і кварты. // Ды казаў: «Маёй Айчыне войска без патрэбы». Праз здрадніцтва «крыж займеў на грудзі, зямлёй узбагаціўся», у той час як Пачціўскі «з-за сваёй маралі нават тое страціў, што дзяды прыдбалі». Таргавіцкі не саромеецца паведаміць, што заваладаў і маёнткам суразмоўцы. Прайдзісвет, ён пнецца нават навучыць суседа, «як разжыцца»: «Не ў ідэях шчасце, а ў шанцы харошым, // Хіба гэта важна, скуль бяруцца грошы?»

Такім чынам, вобраз шляхціца-сармата ў польскамоўнай літаратуры перыяду Асветніцтва прыцярпеў значную эвалюцыю. На пачатку XVIII ст. самацэнзура прымушала аўтараў (Д. Рудніцкі, М. Карыцкі) хаваць заганы вышэйшага саслоўя ў гратэсках і алегорыях; пасля 1764 г. і да перыяду дзейнасці Чатырохгадовага сойма шляхецкія хваробы або выяўляліся ў прадстаўнікоў другога саслоўя (мяшчан, аканомаў – Забельскі школьны тэатр; «Агатка» М. Радзівіла), або ў асобных прадстаўнікоў шляхты (дзівакоў, камічных трыкстараў – «Małżeństwo z kalendarza» Ф. Багамольца). Пасля сойма шляхціц-сармат зрабіўся аб'ектам зацятай крытыкі з боку асветнікаў («Powrót Posła» Ю. Нямцэвіча, «Вызваленая Літва» Я. Ходзькі).

**Літаратура:**


1. *Мальдзіс, А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый: літ. Беларусі пераходнага перыяду (другая палавіна XVII – XVIII ст.) / А. І. Мальдзіс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 352 с.*
2. *Дунін-Марцінкевіч, В. І. Творы / В. І. Дунін-Марцінкевіч. – Мінск: Маст. літ., 1984. – 527 с.*
3. *Парэцкі, Я. І. Міхал Карыцкі / Я. І. Парэцкі. – Мінск: Універсітэцкае, 1991. – 142 с.*
4. *Niemcewicz, J. U. Dwaj panowie Sieciechowie / J. U. Niemcewicz. – Kraków: Universitas, 2003. – 37 s.*
5. *Niemcewicz, J. U. Powrót Posła / J. U. Niemcewicz. – Paryż: Wyd. A. Frank, 1858. – 528 s.*
6. *Bogomoliec, F. Małżeństwo z kalendarza / F. Bogomoliec. – Kraków: Universitas, 2004. – 84 s.*


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова